# ЗМЕСТ


Адысей прыкідваецца вар’ятам . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5
Траянскі конь . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 7
Адысей перамагае цыклопа-людаеда . . . . . . . . . . . . . . . . 13
Мех з вятрамі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 21
Як сябры Адысея ператварыліся ў свіней . . . . . . . . . . . . . 25
Адысей у царстве прывідаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 31
Адысей і сірэны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 35
Адысей і марскія пачвары . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 39
Быкі Геліёса . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 43
Адысей у палоне ў німфы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 47
Адысей і прынцэса Наўсікая. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 51
Вяртанне Адысея . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 55



Хітрамудры Адысей — гэта герой, мараплавец і вандроўнік, прыгодамі якога захапляліся старажытныя грэчаскія дзеці. А старажытныя рымскія дзеці трохі пазней ведалі Адысея пад імем Уліс.

У адрозненне ад многіх старажытнагрэчаскіх герояў, Адысея не лічылі сынам якога-небудзь бога. (Усяго толькі праўнукам. Але затое галоўнага бога — самога Зеўса!) Яго тату звалі Лаэрт, а маму — Антыклея. Лаэрт быў царом маленькага вострава Ітака ў Іянічным моры, каля ўсходняга ўзбярэжжа Грэцыі.

Адысей рос як усе старажытнагрэчаскія дзеці: купаўся ў моры, лавіў рыбу, гуляў у Геракла, не забываўся надзяваць панамку ў спякотны дзень, вучыўся страляць з лука і кідаць дзіду. Але больш за ўсё яму падабалася петэя — гульня накшталт шахмат. Адысею лёгка давалася бачыць на тры хады наперад, і ён абыгрываў нават дарослых.

Пасля Адысей сам стаў дарослым, а Лаэрт пастарэў. Адысей зрабіўся царом і ажаніўся з прыгажуняй Пенелопай, у іх нарадзіўся сынок Тэлемах. Але не доўга Адысей цешыўся. Аднойчы на востраў завіталі нязваныя госці...



# Адысей прыкідваецца вар'ятам

У той час два цары (у Старажытнай Грэцыі ў кожнага горада быў свой цар) збіралі войска, каб напасці на горад Трою. Аднаго цара звалі Менелай, другога — Агамемнан (паспрабуйце вымавіць гэтае імя!). Прыехалі цары і на Ітаку — клікаць Адысея з сабою. Жыхары Троі — траянцы — Адысея нічым не пакрыўдзілі, але такія былі парадкі ў старажытныя часы: калі старэйшыя цары клічуць на вайну, адмаўляцца не выпадае, інакш яны на цябе самога нападуць. Добра, што цяпер можна адмовіцца, калі старэйшыя змушаюць да чагосьці неразумнага.

Як жа Адысею не хацелася ў далёкі край! І ён вырашыў абдурыць Агамемнана (паспрабуйце яшчэ раз вымавіць гэтае імя!) з Менелаем. Нездарма ж усе называлі Адысея хітрамудрым.

Каго не бяруць на вайну? Вар'ятаў! І Адысей вырашыў прыкінуцца вар'ятам: ён запрог быка з аслом у плуг ды пачаў араць зямлю, засяваючы яе соллю замест збожжа. Вы ж, пэўна, ведаеце: дзе прасыпалася соль, нічога не расце.

Госці зайшлі ў палац і спыталі ў Адысеевых слуг, дзе іхні пан. Тыя, уздыхнуўшы, паказалі на поле. А там цар Ітакі — вар'ят вар'ятам — паганяе быка з аслом ды сее соль... Куды такому на вайну?

Так і застаўся б Адысей дома, з Пенелопай і Тэлемахам, каб не ваяр Паламед, які прыплыў разам з Агамемнанам. «Ды ты падмануць нас хочаш, хітрун!» — падумаў ён. Выхапіў з калыскі Тэлемаха, пабег з ім у поле і паклаў дзіця проста пад плуг. У Адысея валасы дыбам сталі: над яго маленькім сынам узняўся капыт вялізнага быка. Адысей рынуўся наперад, схапіў быка за рог (а асла — за вушы) — і спыніў запрэжку за паўкрока ад немаўляці.

— Ты надта разумны для вар'ята, — хмыкнуў Агамемнан.

Мусіў Адысей павініцца. І хоцькі-няхоцькі збірацца на вайну ў далёкую Трою. І яшчэ невядома, як бы скончылася тая вайна, калі б не Адысей...

А Паламеду, які разгадаў яго хітрасць, Адысей адпомсціў. Калі яны былі пад Трояй, Адысей закапаў у яго намёце золата. А пасля напісаў ліст — нібыта ад траянцаў: «Дзякуй табе, Паламед, што пагадзіўся забіць Агамемнана. Вось тваё золата». Грэкі абшукалі намёт і знайшлі золата. Паламеда, хоць ён і лічыўся вынаходнікам літар і гульні ў шашкі, забілі камянямі.




AID